Дзяржаўная ўстанова адукацыі

“Даўгінаўская сярэдняя школа

імя У.І. Слабодчыкава ”

# Знаўцы мовы

(Інтэлектуальная гульня

ў III класе)

Настаўнік-дэфектолаг

Г.П.Пратасевіч

Н.А.Цімашчук

**Знаўцы мовы**

Інтэлектуальная гульня ў ІІІ класе

**Задачы:** замацаваць веды па беларускай мове; развіваць творчае мысленне, пазнавальную цікавасць; узбагачаць слоўнікавы запас; садзейнічаць выхаванню павагі да Беларусі і беларускай мовы.

**Абсталяванне:** мультымедыйная прэзентацыя, канверты з заданнямі, аркушы паперы, граматы, прызы. НА ДЫСКУ: мультымедыйная прэзентацыя, крыжаванка, карткі з заданнямі.

Ход мерапрыемства

І. Арганізацыйны момант.

**1-шы вядучы.** Добры дзень, дарагія сябры! Сёння мы сабраліся, каб паказаць свае веды па роднай мове і даказаць, што ўсе мы — сапраўдныя знаўцы мовы

**2-гі вядучы.** Мова ўзнікла даўным-даўно. Менавіта мова вылучыла чалавека з жывёльнага свету. Сучасныя народы між сабой найперш адрозніваюцца сваёй мовай. Чытаецца эпіграф (слайд 2):

**1-шы вядучы.** Калі мы забудзем сваю мову, не будзем на ёй размаўляць, перастане існаваць і наш народ — беларусы. І з карты свету знікне наша Беларусь.

**2-гі вядучы.** У класе сабраліся мовазнаўцы, якія ведаюць усе сакрэты мовы. Вітаем вас!

ІІ. Конкурсная праграма.

***Крыжаванка “Знаўцы правіл”***

Вядучы задае пытанні.

1. У гэтых сказах выказваецца заклік да дзеяння, пажаданне, просьба, парада ці загад.
2. Яны складаюць алфавіт.
3. Гэтыя гукі ўтвараюцца з дапамогай голасу і шуму або толькі шуму.
4. Гэтыя сказы вымаўляюцца з асаблівым пачуццём.
5. У гэтых сказах заключаецца пытанне.
6. Зычныя гукі, якія ўтвараюцца з дапамогай шуму і голасу.
7. Выказванне на пэўную тэму — гэта...
8. З дапамогай гэтых сказаў людзі паведамляюць пра падзеі, выказваюць свае думкі і пачуцці.

Каманды хорам чытаюць ключавое слова — прыказка.




***Прыказкі і прымаўкі***

Утварыце са слоў прыказкі ці прымаўкі.

1) мазалёў, пад’ясі, паносіш, хлеба *(Мазалёў паносіш — хлеба пад’ясі.)*

2) раскусіш, не, зерня, не, з’ясі, арэх*(Арэх не раскусіш — зерня не з’ясі.)*

3) зрабіць, не, адкладвай, што, сёння, на, заўтра, паспееш, тое *(Не адкладвай на заўтра тое, што паспееш зрабіць сёння.*)

***Загадкавы цыферблат***

**1-шы вядучы.** Замест лічбаў на цыферблаце — літары, а лічбы змешчаны ўнізе. Паспрабуйце разабрацца ў лічбах і расшыфраваць імёны двух народных паэтаў Беларусі.




1) 8.1.10.4 10.2.7.4.6.4
*(Янка Купала.)*
2) 8.10.2.5 10.11.6.4.12
*(Якуб Колас.)*

***Загадкавы свет фразеалогіі***

Вучні атрымліваюць канверт са сваім фразеалагізмам. Задача — растлумачыць яго. Вядучы пытаецца, ці ўсе словы ў фразеалагізмах зразумелыя, і прапануе дадатковую інфармацыю

**Бібікі біць**

Слова бібікі калісьці ўжывалася ў значэнні “гузікі". Гэта дае падставу меркаваць, што першапачаткова выраз бібікі біць меў значэнне “гуляць з гузікамі”. Пазней гэты выраз пачаў ужывацца ў значэнні “гультаяваць, займацца пустой, бескарыснай справай”.

**Ні кала ні двара**

Слова кол некалі мела значэнне “ўчастак ворнай зямлі, надзел каля хаты”. Першапачатковы сэнс выразу быў паказчыкам беднасці чалавека — ні зямлі, ні гаспадаркі.

**На злодзеі і шапка гарыць!**

У далёкія часы ў невялікім мястэчку здарылася пакража. Абкрадзеныя звярнуліся да мудраца. Той павёў іх на кірмаш і крыкнуў: “Гэй! Паглядзіце! На злодзеі шапка гарыць!” Злодзей мімаволі схапіўся за шапку і гэтым выдаў сябе.

1. **Заданне “Партрэт” (Фізкультхвілінка)**

А буду называць часткі цела, а вы іх будзеце паказваць.

Твар, бровы, валасы, галава, вочы, вусны, грыўка, скронь, вейкі.

***“Перакладчыкі”***

Кожная каманда працуе над перакладам слоў. За кожнае правільна перакладзенае слова

- Погода —
- Зеркало —
- Сосулька —
- Ковер —

***“Назаві адным словам”***

Трэба даць агульную назву прапанаваным словам, якія задаюць вядучыя.

- Пчала, жук, чмель. *(Насякомыя.)*
- Званочак, рамонак, васілёк. *(Кветкі.)*
- Верабей, ластаўка, сарока. *(Птушкі.)*
- Сукенка, спадніца, футра. *(Адзенне.)*
- Заяц, воўк, мядзведзь. *(Звяры.)*
- Чаравікі, боты, туфлі. *(Абутак.)*
- Сакавік, студзень, кастрычнік. *(Назвы месяцаў.)*
- Панядзелак, аўторак, серада. *(Дні тыдня.)*
- Лета, восень, зіма. *(Поры года.)*
- Ліпа, дуб, клён. *(Дрэвы.)*
- Агурок, фасоля, морква. *(Агародніна.)*
- Яблык, груша, сліва. *(Садавіна.)*
- Стол, шафа, ложак. *(Мэбля.)*

***Загадкі***

- Што можна бачыць з заплюшчанымі вачыма? *(Сон.)*
- Што плавае без вады? *(Воблака.)*

- Што ідзе без ног? *(Час, снег, дождж.)*
- Хто стукае, грукае, а нідзе яго не відаць? *(Гром.)*
- Якое імя расце ў жыце? *(Васілёк.)*

***“Выправі памылку”***

- “Малако дае карова”, —
Напісаў на кошцы Вова. *(Дошцы.)*
- Закрычаў Рыгорка:
“З неба ўпала горка!” *(Зорка.)*
- Назбіралася народу.
Дзіва, поўны вулей лёду. *(Мёду.)*
- Весела звініць збанок,
Кліча: “Дзеці, на ўрок”. *(Званок.)*
- Не праедзем, дружа:
На дарозе ружа. *(Лужа.)*
- Кажа Славік Светцы:
“Цесна тыгру ў кветцы”. *(Клетцы.)*

***Сінквейн***

1. Мова.
2. Якая?_____, _____.
3. Што робіць?____, ____, ____.
4. Фраза _____.
5. Што? _____

III. Падвядзенне вынікаў.

Журы падводзіць вынікі конкурсаў. Пераможцы ўзнагароджваюцца граматамі і прызамі.